і бялелі вялікія камяні. Гэта ж якая бяда чакала хлопца, калі б не ўратаваў сабака! Дастаў хлопец **акраец** хлеба, падзяліў яго папалам — сабаку і сабе.

— Даруй, што я праганяў цябе, хлеба пашкадаваў.

А потым прывёў сабаку ў свой двор і да самай яго смерці карміў і даглядаў.

Вось такая гісторыя. Засталося толькі дадаць, што гэтым хлопчыкам быў мой дзед *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Да якога стылю і тыпу маўлення адносіцца тэкст? Знайдзіце ў тэксце дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні. Якія яшчэ сродкі стылістычнай выразнасці ўжываюцца аўтарам тэксту?

Карыстаючыся памяткай, сцісла перакажыце частку тэксту пра тое, як сабака засцярог хлопчыка ад небяспекі.

## § 31. Склон назоўнікаў. Асновы назоўнікаў

**190.** Прачытайце тэкст.

Калі слова ўжываецца ў пачатковай форме — у назоўным склоне адзіночнага ліку, — яно толькі называе прадмет, з’яву прыроды, расліну ці жывёлу. Але паміж людзьмі, прадметамі, з’явамі прыроды, раслінным і жывёльным светам існуюць разнастайныя і складаныя адносіны: прасторавыя, часавыя, умовы, мэты ці прычыны. Паглядзіце навокал, звярніце ўвагу на прадметы, якія знаходзяцца вакол вас: сцяна, парта, стол, падручнік, сшытак і інш. Называючы іх, мы толькі даём ім імёны, а ў якіх адносінах яны знаходзяцца адно з адным, нам не зразумела. І толькі з дапамогай розных склонавых форм, якія звязваюць словы, мы можам устанавіць іх узаемазалежнасць: **У класе стаяць парты. За партамі сядзяць вучні.** Граматыка ўстанавіла правілы сувязі слоў і арганізавала словы ў сказах. Гэта сувязь выражаецца пры дапамозе змянення слоў па склонах *(Паводле В. Івановай)*.

Якое значэнне выражаецца ў слове, калі яно ўжываецца ў пачатковай форме? З дапамогай якіх відаў сувязі словы звязваюцца ў сказах?

Які раздзел мовазнаўства ўстанаўлівае правілы сувязі слоў у сказах?

Колькі склонаў у беларускай мове? Як вызначыць склон назоўніка? Вызначце склон назоўнікаў у выдзеленых сказах.


Правообладатель Национальный институт образования

**191.** Спішыце тэкст, ужываючы назоўнікі ў патрэбнай форме. Абазначце склон гэтых назоўнікаў.



Пра *(чалавек)* з дрэннай памяццю кажуць: «Галава як рэшата». Рэшата — гэта не жывая істота, а то і пакрыўдзіцца б магло.

Складаецца рэшата з *(абадок)* і сеткавага *(дно)*. Абадок рабілі звычайна з ліпавай ці вязавай *(кара)*. *(Сетка)* плялі з лубянога *(валакно)* або конскага воласу. Праз дробную *(сетка)* прасейвалі *(мука)* — на хлеб, на аладкі. Дарэчы і загадкі: «Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках», «Пад ліпавым *(куст)* мяцеліца[ф] мяце».

Сіта і ў нашы дні бывае белым ад *(мука)*. Праўда, цяпер яго выгінаюць не з кары, а робяць з *(фанера*)*, дно — з металічнай *(сетка)* *(Паводле М. Маляўкі)*.

***рэ́шата***

Успомніце іншыя фразеалагізмы, якія характарызуюць памяць чалавека. Якія загадкі ўключаны ў тэкст? Складзіце слоўнікавы артыкул да слова-адгадкі, раскрыўшы яго лексічнае значэнне.

**192.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

Яшчэ грэчаскія вучоныя заўважылі, што назоўнікі маюць асноўную, прамую, форму і ўскосную. Ускосныя формы нібы адхіляюцца ад прамой. Адсюль вядомы тэрмін — «скланенне».

Словы ўжываюцца ў маўленні ў той ці іншай форме — скланяюцца. ***Назоўны*** склон — пачатковая форма для называння прадмета: *дапамога, вясёлка*. ***Родны*** — літаральна азначае «атрыманы ад нараджэння», таму і родны (дом *бацькі*, ліст ад *сына*). ***Давальны*** — ад слова *даць*. Найбольш тыповае яго значэнне — назва таго, каму нешта адрасуюць (дзякаваць *сябру*, падарыць *брату*). ***Вінавальны*** так названы таму, што аб'ект, які абазначаны назоўнікам, з'яўляецца прычынай ці «вінай», што выклікала само дзеянне (чытаць *кнігу*, рабіць *зарадку*, хварэць на *грып*). ***Творны*** звязаны з дзеясловам «ствараць», таму што адно з асноўных яго значэнняў выклікала прылада, што стварае дзеянне (рэзаць *нажом*, маляваць *алоўкам*). ***Месны*** — указвае



Правообладатель Национальный институт образования

на месца, дзе адбываюцца падзеі (ісці *па сцежцы*, падарожжа *па краіне*) *(Паводле В. Івановай).*

Які склон называецца прамым, а якія — ускоснымі? Адкуль паходзяць гэтыя тэрміны?

● Знайдзіце сярод прыведзеных у тэксце прыкладаў словазлучэнні, у будове якіх выяўляюцца асаблівасці беларускай мовы.

Перакажыце частку тэксту, у якой даецца тлумачэнне назвам склонаў. Дапоўніце інфармацыю склонавымі пытаннямі.

Змяненне назоўнікаў па склонах называецца **скланеннем.** У залежнасці ад канчаткаў у назоўным склоне адзіночнага ліку і роду большасць назоўнікаў размяркоўваецца па трох тыпах скланення: **1, 2** і **3-е скланенне.**

**193.** Прачытайце схему, раскажыце пра тыпы скланення назоўнікаў. Падбярыце з дапамогай малюнкаў прыклады назоўнікаў кожнага скланення. Запішыце словы, абазначце канчаткі.

**Тыпы скланення назоўнікаў**



1-е скланенне
ж. р. -*а*, -*я*



2-е скланенне
м. р. □; н. р. -*о*, -*е*, -*а*



3-е скланенне
ж. р. □

**194.** Прачытайце верш. Сфармулюйце яго асноўную думку.

**Беларус**

Белы ручнік мой, белы абрус,
Сам я няцёмны душою.
Хто ў белым свеце я? Я — беларус![сн]
Будзьце знаёмы са мною.


Правообладатель Национальный институт образования

Дружбу цаню і гатовы дружыць
Я ці не з цэлым сусветам.
Свету адкрыты, хачу вольна жыць,
Добрым служыць запаветам*.

*В. Жуковіч.*

Знайдзіце ў вершы назоўнікі, вызначце іх склон. Выпішыце назоўнікі ў пачатковай форме, у дужках абазначце скланенне.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне ‘наказ, дадзены кім-небудзь сваім патомкам’. Складзіце з гэтым словам сказ, у якім заключалася б асноўная думка верша.

**195.** Разгледзьце малюнак. На які зычны можа заканчвацца аснова назоўніка? Да якога скланення адносяцца прыведзеныя назоўнікі? Запішыце іх, выдзеліце аснову, падкрэсліце літары, якія абазначаюць апошні зычны гук асновы. Падбярыце свае прыклады назоўнікаў 1-га скланення ў адпаведнасці з тыпам асновы.

Назоўнікі з асновай на цвёрды зычны:
*рыба*, *згода*, *спадчына*, *дамова*

Назоўнікі з асновай на зацвярдзелы зычны:
*мяжа*, *груша*, *сястра*, *пушча*

Назоўнікі з асновай на мяккі зычны:
*цішыня*, *хваля*, *сям*[йа], *таполя*

Назоўнікі з асновай на ***-г-***, ***-к-***, ***-х-***:
*адвага*, *страха*, *рука*, *сястрычка*

**196.** Прачытайце верш.

**Твая Беларусь**

Мяжуе з Польшчай,
Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны **край**, твая
**Айчына** —
**Жыццё** тваё і **гонар** твой.
І ты яе запомні імя,



Правообладатель Национальный институт образования

Як **неба, сонца** і **зару.**
Твая **зямля**, твая **Радзіма**
Названа светла —
**Бе-ла-русь!**

*Ю. Свірка.*

Спішыце. Абазначце скланенне выдзеленых назоўнікаў.
● Падкрэсліце словы з арфаграмай «Правапіс уласных назоўнікаў».
Вывучыце верш на памяць.

## § 32. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (у давальным і месным склонах адзіночнага ліку)

**197.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Без голасу, а вые, без рук, а абрусы сцеле. 2. Цякла, цякла і пад шкло лягла. 3. Сядзіць пані ў жупане*, хто жупан здзірае, той слёзы праліваае. 4. Сама пані ў каморы, а яе косы на двары. 5. Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае. 6. Маленькага росту, прыгожага стану, хто яе знае, той розум мае.








Запішыце адгадкі. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў. Ахарактарызуйце аснову кожнага назоўніка.

Праскланяйце ў адзіночным ліку па адным назоўніку з асновай кожнага тыпу. У якіх склонах назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі?

Склонавыя канчаткі назоўнікаў 1-га скланення залежаць ад характару асновы, а ў давальным і месным склонах — ад націску.

Апошнія зычныя асновы назоўнікаў 1-га скланення ў давальным і месным склонах на *-г-, -к-, -х-* чаргуюцца: ***г//з, к//ц, х//с***: *дарога — (па) дарозе, сцежка — (на) сцежцы, скруха* — (у) скрусе.*


Правообладатель Национальный институт образования